# Эпоха барока і беларуская культура

- **Барока** (ад італ.: *Barocco* — няправільны, дзіўны) — вядучы кірунак у еўрапейскім, у т. л. беларускім мастацтве і архітэктуры з апошняй трэці XVI ст. і амаль да канца XVIII ст. Адметныя рысы барока — урачыстасць, кантрастнасць, ускладненасць форм, параднасць, пышны дэкор. Стыль эпохі Контррэфармацыі.
- Першапачаткова тэрмін «барока» меў негатыўны сэнс, бо сваёй відавочнай пышнасцю і вычварнасцю супрацьпастаўляўся гармоніі Рэнесансу. Галоўным фактарам узнікнення стылю барока з'яўляецца каталіцкая контррэфармацыя, якая з дапамогай новага мастацтва імкнулася абвергнуць ідэі гуманізму рэнесансу, барока быў прызваны праслаўляць і прапагандаваць моц улады, знаці і царквы, што, у пэўнай ступені, спарадзілі рэфармацыйны рух ва ўсёй Еўропе. Але разам з тым барока выразіў прагрэсіўныя ідэі аб складанасці светабудовы, бясконцасці і мнагастайнасці сусвету, яго зменлівасці. Мастацтва барока пачало адлюстроўваць дуалістычную прыроду чалавека, барацьбу ў ім нябеснага і зямнога пачаткаў, чалавек пачаў успрымацца як частка сусвету, як складаная асоба, перажываючая ўнутраныя канфлікты.

# Беларускае барока

- Барока для беларускай культуры з’явілася той вяршыняй, якой была, мабыць, готыка — для Францыі, рэнесанс — для Італіі, класіцызм — для Расіі. Развіццё беларускага барока прайшло тры перыяды: ранняе (канец XVI — першая палова XVII ст.), сталае (другая палова XVII — 30-я гг. XVIII ст.) і позняе, ці віленскае (30 — 80-я гг. XVIII ст.). Пачатак гэтай плыні ў Беларусі звязаны з будаўніцтвам, намаганнямі 1-га ардыната нясвіжскага князя Мікалая Крыштофа Радзівіла Сіроткі, першага ў Рэчы Паспалітай помніка архітэктуры барока — касцёла езуітаў у Нясвіжы ў 1584—1593 гг. па праекце італьянскага архітэктара-езуіта Джавані Марыя Бернадоні. Будынак у агульных рысах паўтарае галоўны ордэнскі храм езуітаў Іль Джэзу ў Рыме і ўяўляе сабой першую ў беларускім дойлідстве 3-нефавую крыжова-купальную базіліку.
- Услед за езуіцкім касцёлам ў Нясвіжу ў беларускіх гарадах і вёсках пачынаюць будавацца пампезныя касцёлы, кляштары, магнацкія рэзідэнцыі. Дынамічныя формы іхніх фасадаў, хвалістыя, неспакойныя лініі дэкору, кантрасныя спалучэнні мусілі сімвалізаваць зменлівасць і хуткаплыннасць чалавечага жыцця.
- Рысы барока выявіліся таксама ў праваслаўных і ўніяцкіх храмах (Мікалаеўская царква ў Магілёве, базыльянская царква і іканастас у Супраслі, комплекс у Жыровіцах, уніяцкія цэрквы ў Барунах і Княжыцах)[4]. У праваслаўным храмабудаўніцтве стыль атрымаў адмысловую трактоўку, якая адрознівае яго ад вобразаў храмаў іншых канфесій Беларусі і праваслаўных цэркваў замежжа, спалучае ўласна праваслаўныя[5] візантыйскія і мясцовыя традыцыі[6] з мастацкімі асаблівасцямі барока, вылучаецца высокім узроўнем эмацыйна-эстэтычнага ўздзеяння[5] і надае непаўторнасць асобным помнікам[7]. Самабытна выглядае драўлянае культавае дойлідства на Беларусі[8

# Літаратура і кніжная справа

- У першай палове XVII ст. працягвалася развіццё друкарскай справы ў Вялікім Княстве Літоўскім. Друкаваная кніга стала даступнай для больш шырокага кола людзей. Яна выконвала адукацыйныя і асветніцкія функцыі. У той час вучыліся чытаць не толькі па Псалтыры, але і з дапамогай буквароў — напрыклад, выкарыстоўвалі Еўеўскі буквар 1618 г. (Еўе — зараз г. Вевіс у Літве).
- У першай палове XVII ст. актыўна развівалася палемічная літаратура. Аўтары — праваслаўныя, каталікі, уніяты, пратэстанты — імкнуліся даказаць слушнасць свайго хрысціянскага веравучэння. Утварыўся саюз праваслаўных і пратэстанцкіх прапаведнікаў супраць каталіцкіх ідэолагаў. Сярод апошніх вылучаецца постаць першага рэктара Віленскага ўніверсітэта *Пятра Скаргі* — майстра палемікі ў друку.
- Пошук знакамітых продкаў з боку шляхты і магнатаў садзейнічаў стварэнню гербоўнікаў і родавых легендаў. У сярэдзіне XVII ст. прафесар Віленскага ўніверсітэта езуіт *Альберт Віюк-Каяловіч* напісаў «Гісторыю Літвы», у якой шмат увагі надаў паходжанню шляхецкіх родаў. Гісторыя паступова аддалялася ад багаслоўя і займала сваё асобнае месца сярод навук пра чалавека.
- Пашыралася мемуарная літаратура ў форме ***дыярыушаў*** (дзённікаў) — напрыклад, дыярыушы *Фёдара Еўлашоўскага, Афанасія Філіповіча*; літаратура падарожжаў («Перэгрынацыя» *Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі*); біяграфіі («Авантуры майго жыцця» *Саламеі Пільштыновай-Русецкай*).
- Магнацкія роды спрабавалі сцвердзіць сваю ролю ў гісторыі не толькі ў творах літаратуры, але і іканаграфічнымі сродкамі. У іх рэзідэнцыях сталі з'яўляцца родавыя галерэі і альбомы.

# Тэатр

- На тэрыторыі Беларусі актыўна развіваўся школьны тэатр. Ён паходзіў са шкалярскіх і студэнцкіх пастановак на рэлігійныя тэмы. Пастаноўкі арганізоўвалі навучэнцы каталіцкіх і ўніяцкіх калегіумаў, пратэстанцкіх школ. Але і вучні праваслаўных школ не адмаўляліся ад удзелу ў падобных відовішчах. Сюжэты ствараліся на евангельскія, старазапаветныя або антычныя тэмы, а пры іх раскрыцці выкарыстоўвалася шматмоўе (латынь, польская, старабеларуская мовы).
- Яшчэ адным запатрабаваным сярод простага насельніцтва відам тэатральнага мастацтва заставаўся лялечны тэатр — ***батлейка***. Яго пастаноўкі ажыццяўлялі таленавітыя акцёры-самародкі. Сюжэты датычыліся гісторыі Божага нараджэння, а ў якасці інтэрмедый уключаліся сцэнкі з удзелам персанажаў са штодзённага жыцця. Батлеечныя пастаноўкі былі разлічаны на простага гледача, і тэксты гаварылі пераважна на старабеларускай мове.
- Пры магнацкіх рэзідэнцыях пастаянна знаходзіліся артысты, пастаноўшчыкі і музыканты. Яны ўдзельнічалі ў правядзенні пахавальных цырымоній, баляў, маскарадаў і г. д. Таксама артысты выступалі ў прыватных пастаноўках, дзе гледачамі былі сем'і магнатаў. Да ўдзелу ў пастаноўках прыцягвалася мясцовая шляхта. Фактычна да XVIII ст. такія напалову аматарскія трупы ператварыліся ў прыдворныя тэатры. Пры рэзідэнцыях магнатаў адкрываліся школы для навучання музыкантаў, артыстаў балета. Рэжысёрамі прыватных пастановак з'яўляліся замежныя драматургі.
- Пры двары нясвіжскага магната *Міхала Казіміра Радзівіла (Рыбанькі)* быў арганізаваны прыватны тэатр, у спектаклях якога ўдзельнічалі (на ўзор французскіх каралёў) сям'я князя, кадэты яго ваеннай школы і нават прыгонныя сяляне. Апошнія пасля мастацкай падрыхтоўкі атрымлівалі заробак за ўдзел у пастаноўках. Жонка магната — ***Францішка Уршуля*** — пісала лібрэта да опер. Радзівілы мелі некалькі пляцовак для сцэнічных пастановак, што стварала магчымасць паказаць розныя сюжэты: ад камерных сцэн да ваенных баталій. Падобныя тэатры і музычныя калектывы мелі Агінскія ў Слоніме, Сапегі ў Ружанах. У літаратуры такі тып тэатра атрымаў назву прыгоннага. Аднак у пастаноўках былі занятыя пераважна прафесійныя артысты і музыкі, запрошаныя з-за мяжы. Удзелу прыгонных сялян ніхто не адмаўляе. Іх падрыхтоўка і ўдзел у пастаноўках дазвалялі зрабіць творчую кар'еру і ўзняцца па сацыяльнай лесвіцы за кошт свайго таленту

# Выяўленчае мастацтва

- У XVII — першай палове XVIII ст. эстэтычныя прынцыпы барока праніклі ў розныя віды выяўленчага мастацтва. Свецкі жывапіс характарызуецца развіццём такіх жанраў, як партрэт і батальнае мастацтва. Гэта забяспечвала патрэбы шляхты і магнатэрыі ў візуалізацыі гісторыі свайго роду і яго ўнёску ў праслаўленне дзяржавы. Даследчыкі вылучаюць рыцарскі, парадны, пахавальны партрэты.
- Найбольшай папулярнасцю сярод шляхты карыстаўся так званы ***«сармацкі партрэт»***. Ён характарызуецца сімвалічнымі ў сваіх элементах адзеннем і ўпрыгажэннямі, рэалістычнай выявай асобы, атрыбутамі годнасці і прыналежнасці да роду і дзяржаўнай сістэмы ВКЛ.
- Сярод партрэтаў другой паловы XVI — першай паловы XVIII ст. вылучаюцца *парадны* і *пахавальны партрэты*. Іх мэта — прадставіць асобу. Але прызначэнне зусім рознае. Парадны партрэт сведчыў аб статусе асобы: атрыманне дзяржаўнай пасады, шлюб, прыдбанне маёмасці, змена тытула ці герба ўладальніка. Магнацкія роды Радзівілаў, Сапегаў, Агінскіх стварылі цэлыя галерэі фамільных партрэтаў, каб пацвердзіць сваю магутнасць і шматлікасць. Для размяшчэння партрэтаў выкарыстоўваліся доўгія прахадныя галерэі палацаў, а таксама залы бібліятэк.
- Ва ўмовах безупынных баявых дзеянняў шляхціц або магнат маглі памерці далёка ад месца пахавання роду — радавой усыпальніцы. Таму ўзнікла традыцыя прымацавання да трунаў партрэта і герба, па якіх труны распазнавалі. З часам такі партрэт зрабіўся сімвалам памяці аб продку. На выяве сталі з'яўляцца элементы герба, імя, пасады, тытулы і нават звесткі пра маёмасць. Ствараліся не толькі мужчынскія, але і жаночыя пахавальныя партрэты.
- *Батальны жанр* у выяўленчым мастацтве прадстаўляў знакавую бітву ці падзею дыпламатычнага характару — напрыклад, «Прыезд Міхала Казіміра Радзівіла з пасольствам да Рыму», з імкненнем прадставіць яе як мага падрабязней. Для такіх твораў была характэрная прамалёўка не толькі асноўных дзеючых асоб, але таксама прыроды і ўмоў асяроддзя.

# Архітэктура

- Асабліва яскрава культура барока праявілася ў архітэктуры, як царкоўнай, так і свецкай. Распрацоўваліся каноны архітэктуры барока — своеасаблівыя порцікі, праёмы і аздабленне вокнаў, унутраны і знешні дэкор. Усё гэта знайшло ўвасабленне ў магнацкіх рэзідэнцыях. Першым узорам такіх навацый стала рэзідэнцыя Радзівілаў у Нясвіжы. Палацавы комплекс складаўся з асноўнага будынка, узмоцненай земляной фартыфікацыі, уязной брамы, замкнёнага двара і асобнага парку.
- Новыя палацава-замкавыя комплексы былі закладзены ў Быхаве, Ляхавічах, Слуцку. Сталі перабудоўваць дзяржаўныя замкі. У гарадах ратушы пачалі ўзводзіць у стылі барока. Яны сталі шматфункцыянальнымі. Некаторыя ратушы ўпрыгожваў гарадскі гадзіннік.
- Аднак перамены ў свецкай архітэктуры непараўнальныя з тымі, што адбываліся ў сакральным будаўніцтве. Храмавае будаўніцтва ў стылі барока пачалі развіваць розныя манаскія каталіцкія ордэны. Першынство сярод іх належала езуітам. Яны стваралі не проста храм, а цэлы царкоўны комплекс, які ўключаў храм, прыбудаваны да яго калегіум, кляштарныя памяшканні. Для аздаблення звонку і ўнутры храма дазвалялася выкарыстоўваць як роспіс сцен, ляпніну, так і розныя скульптурныя фігуры святых. Многія абразы займелі сваю цудатворную гісторыю, якая прадугледжвала вылучэнне для яе своеасаблівай прасторы ў храме.
- Асноўным тыпам храма стала трохнефавая базіліка. Шматпавярховасць дазваляла выкарыстоўваць хоры для размяшчэння вялікіх арганаў і ўладкавання спецыяльных гаспадарчых памяшканняў. Знешне храм ператвараўся ў дамінуючы манументальны аб’ект гарадской ці сельскай прасторы. Будынак храма на высокім месцы быццам узносіўся над горадам.
- У пачатку XVIII ст. на тэрыторыі ВКЛ атрымаў пашырэнне стыль т. зв. ***віленскага барока***. Яго з’яўленне стала вынікам змен у прапорцыях званіц-вежаў і дэкоры храмаў, прыўнесеных стылем ракако. Узорам гэтага архітэктурнага кірунку стала творчасць ***Яна Глаўбіца*** (перабудова Сафійскага сабора ў Полацку, бернардынскага касцёла ў Менску).

# Архітэктура



20-метровы цэнтральны алтар
касцёла Францыска Ксаверыя
ў Гродне (1736 г.). Дрэва, таніраванае
пад мармур (сучасны выгляд)



Касцёл Святога Іосіфа.
Менск. 1652 г.
(сучасны выгляд)



Сафійскі сабор у Полацку пасля перабудовы (сучасны выгляд)

# Музыка

- Музычнае мастацтва было прадстаўлена царкоўнай і свецкай музыкай. У праваслаўных і ўніяцкіх храмах, манастырах развіваліся харавыя спевы. Хары выконвалі творы на 4 і болей галасоў. Захаваліся запісы асноў набажэнства і спеваў — напрыклад, рукапісныя *ірмалоі*. Яны прызначаліся для аднагалосага вакалу і так званага знаменнага распеву — па знаменным (крукавым) запісе. У XVII ст. распаўсюдзіліся мясцовыя варыянты спеву — слуцкі, супрасльскі, магілёўскі і інш.
- З другой паловы XVI ст. у Беларусі пачалі друкавацца зборнікі пратэстанцкіх песнапенняў з пяцілінейнымі еўрапейскімі нотамі. У беларускіх літургічных кнігах такія ноты ўпершыню былі выкарыстаны ў зборніку «Супрасльскі Ірмалагіён», які стварыў Багдан Анісімавіч з Пінска ў 1598 г. Вядомым помнікам беларускай музыкі гэтага часу з'яўляецца таксама «Полацкі сшытак», запісаны круглымі італьянскімі нотамі, якія леглі ў аснову сучаснай нотнай граматы.
- Цэнтрам каталіцкай музыкі быў Віленскі ўніверсітэт. Там працавалі адукаваныя еўрапейскія кампазітары, якія рыхтавалі і друкавалі музычныя творы. У другой палове XVII ст. Сігізмунд Лаўксмін выдаў першы ў Вялікім Княстве Літоўскім падручнік па тэорыі харальных спеваў на лацінскай мове.
- У касцёлах і ўніяцкіх храмах гучала арганная музыка, для якой патрабаваліся высокі ўзровень рамесніцкай тэхнікі і адпаведная акустыка. *Арган* — гэта клавішна-духавы музычны інструмэнт, самы вялікі ў свеце. З прычыны значнага памеру, асаблівасцяў гуку і тэмбру, ён лічыцца «каралём інструментаў». У Берасці ў сярэдзіне XVI ст. сваім майстэрствам славіўся арганіст Трошка. У 1611—1615 гг. на сродкі шляхціца Андрэя Скарульскага быў пабудаваны вялікі арган для нясвіжскага касцёла езуітаў. Адным з найлепшых арганаў XVII ст. лічыцца інструмент Жыровіцкага базыльянскага манастыра.
- Пры каралеўскім двары, у сядзібах магнатаў дзейнічалі прыгонныя аркестры і капэлы. Аркестравая музыка суправаджала спектаклі, балі, паляванні, ваенныя парады і рэлігійныя службы. Выконвалі творы як заходнееўрапейскіх, так і мясцовых кампазітараў — Міхала Казіміра Агінскага, Яна Давіда Голанда, Мацея Радзівіла і інш. Кіравалі аркестрамі знакамітыя еўрапейскія музыканты. Прыдворных аркестрантаў і спевакоў рыхтавалі ў прыватных школах. Такія навучальныя ўстановы былі ў Слуцку, Нясвіжы, Гародні, Паставах, Слоніме.
- У школьных тэатрах езуітаў, дамініканцаў і іншых манаскіх ордэнаў пастаноўкі п'ес таксама суправаджаліся музыкай. Часам гучалі народныя мелодыі, а ў XVIII ст. вучні сталі выконваць нават оперныя творы.

- Эпоха Барока – гэта XVII стагоддзе.
- 1. У XVII ст. Еўропа перажывала бурлівыя, драматычныя падзеі. Усё XVII ст. можна назваць *прамежкавай эпохай* паміж Адраджэннем і Асветай. Роля яе крытычная, таму што падзеі менавіта гэтага стагоддзя (англійская буржуазная рэвалюцыя, Фронда і ўстанаўленне абсалютызму ў Францыі, 30-гадовая вайна ў Еўропе, так званая Смута ў Масковіі) вызначылі тэмпы далейшага сусветнага развіцця.
- 2. У XVII ст. зноў актывізуецца царква, бярэ, на шчасце, своеасаблівы рэванш пасля Рэфармацыі – надыходзіць эпоха каталіцкай *контррэфармацыі.*
- 3. У той жа час XVII ст. – прынцыпова новая эра ў развіцці сучасных *навук* – фізікі, біялогіі, матэматыкі, праўда са сваімі, ужо навуковымі, забабонамі, не меншымі, чым, скажам, язычніцкія.
- 4. XVII ст. – час фармавання і так званага «*вышэйшага свету*», («свецкага грамадства». "бамонда"), а таксама *прафесійнага* літаратурнага асяроддзя – праслойкі людзей, якія жывуць выключна сваім пяром. Іх з' яўленне, безумоўна, было падрыхтавана Адраджэннем з яго ўніверсітэтамі, кнігадрукаваннем і культам адукаванасці.
- 5. У плане эстэтычным XVII ст. – эпоха двух магутных стыляў – *класіцызму* і *барока*. Класіцызм у чыстым выглядзе ў XVII ст. усталяваўся толькі ў Францыі, адкуль ужо ў XVIII ст. распаўсюдзіўся ў іншыя краіны Еўропы. Больш правільна лічыць XVII ст. векам барока. Некаторыя даследчыкі гавораць нават пра эпоху Барока (калі гаворка пра эпоху, то неабходна яе назву пісаць з вялікай літары; калі пра эстэтычную сістэму, стыль – то з малой літары). У славянскіх краінах Барока ахоплівае і XVIII ст.

- Выдатным прадстаўніком літаратуры барока з’яўляецца **Сімяон Полацкі** (Самуіл Пятроўскі-Сітняновіч) (1629—1680) — пісьменнік, асветнік, філосаф, педагог.
- Паходзіў ён з заможнай полацкай сям’і. Вучыўся спачатку ў Кіева-Магілянскай калегіі — адной з лепшых навучальных устаноў таго часу, а пасля — у Віленскай акадэміі. У 1656 годзе пастрыгся ў манахі. А праз восем гадоў прыняў запрашэнне рускага цара Аляксея Міхайлавіча і пераехаў у Маскву.
- Творчая спадчына Сімяона Полацкага шматгранная. Ён пісаў сатыру, драматычныя і багаслоўскія творы, вершы, павучанні, словы.




*В. Варэца, Л. Варэца.* Сімяон Полацкі (1995)

Сімяон Полацкі імкнуўся да ўдасканалення літаратурнага майстэрства, займаўся паэтычнымі эксперыментамі. Яшчэ ў кіеўскі і віленскі перыяды ён напісаў кнігу «Розныя вершы» на польскай і лацінскай мовах. Творы зборніка вызначаліся дыдактызмам і маралізатарствам, як, напрыклад, верш «Папярэджвай на пачатку», дзе паэт-настаўнік дасціпна і даходліва тлумачыў, чаму варта пазбягаць ліхіх думак:

Дубчык маладзенькі як хочаш скіруеш —
Дрэва ж старое ўжо не напрастуеш.
Рэчку з вытоку ўтаймаваці можна,
А разальецца — грэбля не паможа.
Полымя ў іскры тушаць: разгарыцца —
Можа так стацца — вады не збаіцца.
<...>
Гэтак і думак брыдкіх не трымайся —
Выкінь без жалю, з імі развітайся.